# «МЫ БУДЗЕМ УСЁ РАБІЦЬ ДЛЯ

## Прэзідэнт пажадаў маленькім пацыентам сустракаць Новы год

Апошні ў 2024 годзе рабочы дзень Прэзідэнта Беларусі Аляксандра Лукашэнкі атрымаўся вельмі кранальным. Кіраўнік дзяржавы наведаў Мінскую абласную дзіцячую клінічную бальніцу і асабіста павіншаваў малых пацыентаў і іх бацькоў. Новы год яны сустракаюць не дома, а ў бальнічных сценах, таму ім вельмі патрэбныя цяпло і ўвага.



Фота БелТА.

### «МЫ СТВАРЫЛІ ТУТ САМУЮ ПЕРАДАВУЮ БАЛЬНІЦУ»

Свята не перашкодзіла абмеркаваць і надзённыя пытанні з адказнымі асобамі. Кіраўніку дзяржавы далажылі ў цэлым аб стане спраў у дзіцячай абласной бальніцы. Галоўны ўрач установы Дзмітрый Зайцаў расказаў, што за год у бальніцы лечыцца каля 22 тысяч пацыентаў і выконваецца звыш 13 тысяч аперацыйных умяшанняў. Працуе 219 урачоў. У Мінскай абласной дзіцячай клінічнай бальніцы аказваюцца ўсе віды медыцынскай дапамогі. Большасць хірургічных умяшанняў выконваецца малаінвазійным шляхам: 98 % дзяцей апераваны лапараскапічна. У 2020 годзе з інавацыйнага фонду Прэзідэнта былі выдзелены грошы, на якія было закуплена самае сучаснае аперацыйнае абсталяванне. Дзякуючы гэтаму Мінская абласная дзіцячая клінічная бальніца па аснашчанасці аперацыйным абсталяваннем можа канкурыраваць з любой рэспубліканскай установай.

Кіраўнік дзяржавы заўважыў, што ўзровень бальніцы вельмі высокі, і пацікавіўся, ці дапамагае Мінская абласная дзіцячая клінічная бальніца іншым рэгіёнам. Міністр аховы здароўя запэўніў, што тут аказваецца медыцынская дапамога пацыентам з усіх абласцей, калі ўзнікае такая неабходнасць. «Мы стварылі тут самую передавую бальніцу і аснасцілі прыстойна. Таму абавязкова павінны дапамагаць. Вобласць, зразумела, вялікая, але, калі звярнуліся людзі з іншай вобласці, адкідаць нельга. Гэта ж дзеці», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

### «КАЛІ ХВАРЭЕ ДЗІЦЯ — ГЭТА КАТАСТРОФА»

У аддзяленні анестэзіялогіі і рэанімацыі бальніцы нядаўна быў праведзены капітальны рамонт. Яго вынікі асабіста ацаніў Аляксандр Лукашэнка. Ён агледзеў рэанімацыйную залу, ізалятар для дзяцей старэйшага ўзросту, палаты сумеснага знаходжання дзяцей і іх бацькоў, палату для нованароджаных дзяцей. «Аддзяленне зрабілі, таму лячыце ўсіх, хто да вас звяртаецца. Асабліва дзетак», — паставіў задачу кіраўнік дзяржавы.

У палатах для нованароджаных, у палатах сумеснага знаходжання з бацькамі створаны ўсе ўмовы, каб і пацыентам было камфортна, і медыцынскі персанал мог пастаянна за імі назіраць. Карына Судноўская адзначыла, што створаны ўмовы і для таго, каб бацькам было зручна клапаціцца аб дзецях. «Гэта добрая справа», — адзначыў Прэзідэнт.

Таксама Аляксандр Лукашэнка азнаёміўся з работай педыятрычнага аддзялення № 1 для дзяцей з кардыялагічнай і рэўматалагічнай паталогіяй. Загадчыца аддзялення Святлана Клечан расказала, што за год тут праляўчыліся 1200 пацыентаў. «Ці бывае так, што ў вас не хапае магчымасцяў, месцаў не хапае?» — спытаў кіраўнік дзяржавы. Медыкі запэўнілі, што такога не здараецца, дапамагаюць усім пацыентам, у тым ліку з іншых абласцей.

Аляксандр Лукашэнка завітаў у палату, у якой дзеці ляжаць са сваімі мамамі. Прэзідэнт прызнаўся, што сам вельмі хвалюецца, калі хварэюць дзеці. Ён падкрэсліў: вельмі добра, што ў бальніцы дзеці, якім таксама нялёгка, знаходзяцца разам з бацькамі.

Да маленькіх пацыентаў кіраўнік дзяржавы прыехаў не з пустымі рукамі, а з падарункамі. Дзеці таксама павіншавалі Прэзідэнта з Новым годам, пажадалі яму шчасця, здароўя і поспехаў у рабоце. «Калі ў мяне будуць поспехі ў рабоце, то ў вас таксама будуць», — пажартаваў Аляксандр Лукашэнка. Ён таксама пагутарыў з пацыентамі і іх бацькамі.

Сярод пацыентаў у свой час быў і Раман Кагадоўскі, які гераічна выратаваў свайго малодшага брата з пажару. А потым медыкі гераічна ратавалі самога хлопца. «Як сябе адчуваеш?» — спытаў Прэзідэнт. «Нармальна. Цяпер на абследаванне прыйшоў», — адказаў хлопец. Дактары адзначаюць, што для іх Раман — сапраўдны герой.

# ПАВАЖАЮЧЫ АДЗІН АДНАГО І ВЫКОНВАЮЧЫ ПРАВАВЫЯ НОРМЫ:

Беларусь з 1 студзеня 2025 года ўжо трэці раз прымае старшынства ў органах Еўразійскага эканамічнага саюза.
У сувязі з гэтым кіраўнік дзяржавы Аляксандр Лукашэнка ў якасці старшыні Вышэйшага Еўразійскага эканамічнага савета накіраваў зварот кіраўнікам дзяржаў — членаў Еўразійскага эканамічнага саюза, які апублікаваны на афіцыйным сайце Прэзідэнта Беларусі.

«За мінулае дзесяцігоддзе наш саюз здолеў даказаць сур'ёзнасць ідэі цеснай эканамічнай інтэграцыі, сваю жыццяздольнасць і рэзультатыўнасць. Сумеснымі намаганнямі мы нарасцілі патэнцыял макраэканамічнай устойлівасці і мінімізавалі ўплыў негатыўных геапалітычных фактараў, — гаворыцца ў звароце. — 2025 год для Еўразійскага эканамічнага саюза будзе знакавым: завяршаецца пяцігодка рэалізацыі Стратэгічных напрамкаў развіцця еўразійскай эканамічнай інтэграцыі і закладваецца фундамент для старту новага этапу і ўвасаблення ў жыццё Дэкларацыі аб далейшым развіцці эканамічных працэсаў у рамках ЕАЭС да 2030 года і на перыяд да 2045 года «Еўразійскі эканамічны шлях».

У мэтах умацавання плённага інтэграцыйнага ўзаемадзеяння ў звароце прапануецца вызначыць асноўныя прыярытэты, якія павінны апынуцца ў цэнтры агульнай увагі ў гэтым годзе. Аляксандр Лукашэнка ўпэўнены, што паслядоўная рэалізацыя гэтых кірункаў будзе садзейнічаць далейшаму развіццю еўразійскай інтэграцыі і пашырэнню ўзаемавыгаднага супрацоўніцтва.

### ТЭХНАЛАГІЧНЫ ПАТЭНЦЫЯЛ І КААПЕРАЦЫЯ

«Неабходна засяродзіць сумесныя намаганні на развіцці тэхналагічнага патэнцыялу дзяржаў — членаў ЕАЭС, фарміраванні агульнай прасторы кааперацыйнага ўзаемадзеяння ва ўсіх галінах эканомікі», — адзначыў Аляксандр Лукашэнка.

У гэтых мэтах трэба актывізаваць рэалізацыю сумесных праектаў і праграм у сферах інфармацыйна-камунікацыйных тэхналогій, штучнага інтэлекту, электратранспарту, мікраэлектронікі, робататэхнікі і новых матэрыялаў. «Супрацоўніцтва ў гэтым кірунку дасць магчымасць забяспечыць надзейную базу для развіцця партнёрскіх адносін паміж прадпрыемствамі дзяржаў — членаў ЕАЭС у мэтах стварэння новых імпартазамяшчальных вытворчасцяў, выпуску сумеснай прадукцыі пад еўразійскім брэндам», — заявіў беларускі лідар.

### ХАРЧОВАЯ БЯСПЕКА

Для павышэння харчовай бяспекі саюза беларускі бок прапануе сканцэнтраваць намаганні на развіцці селекцыі і насенняводства, павышэнні генетычнага патэнцыялу племяннoй сельскагаспадарчай жывёлы.

### АДЗІНАЯ ТРАНСПАРТНАЯ ПРАСТОРА І ЛАГІСТЫКА

Аляксандр Лукашэнка заявіў аб неабходнасці завяршыць фарміраванне адзінай транспартнай прасторы з прыняццем роўных (недыскрымінацыйных) умоў і забеспячэннем справядлівай канкурэнцыі, асабліва пры ажыццяўленні паветраных перавозак паміж краінамі ЕАЭС.

Трэба прадоўжыць работу па адмене дазвольнай сістэмы на ўсе віды міжнародных аўтамабільных перавозак грузаў у трэція краіны і з іх.

«Уяўляецца асабліва важным ствараць новыя і ўдасканальваць дзеючыя лагістычныя ланцужкі бесперашкоднай дастаўкі грузаў, развіваць «бясшвовыя» і бяспечныя міжнародныя транспартныя калідоры, якія злучаюць дзяржавы — члены ЕАЭС», — гаворыцца ў звароце.

### РОЎНЫЯ ЎМОВЫ І ПРАЗРЫСТАЯ КАНКУРЭНЦЫЯ

Асобную ўвагу Прэзідэнт Беларусі звярнуў на неабходнасць далейшай мэтанакіраванай работы па выраўноўванні ўмоў ажыццяўлення гаспадарчай дзейнасці, стварэнні агульнага і празрыстага канкурэнтнага асяроддзя на ўнутранай прасторы саюза.

«Пры гэтым ключавое значэнне мае рэзультатыўнае завяршэнне фарміравання агульных энергетычных рынкаў ЕАЭС», — падкрэсліў кіраўнік дзяржавы.

### АБАРОНА ЎНУТРАНАГА РЫНКУ

У бягучых умовах беларускі бок бачыць неабходнасць прадоўжыць работу па абароне ўнутранага рынку. Такая дзейнасць павінна быць накіравана як на ўдасканаленне мытна-тарыфнага рэгулявання для выраўноўвання ўмоў гаспадарання ў ЕАЭС, так і на паўнацэнную абарону еўразійскага рынку ад небяспечнай прадукцыі.

«Важна забяспечыць прыняцце заснаваных на перадавой сусветнай практыцы і навуковай доказнай базе адзіных тэхнічных